PolotskSU

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Полоцкий государственный университет»

# Романо-германская филология. Контексты культуры и литературные связи

*Международный сборник научных статей*

**Новополоцк**
**2017**

PolotskSU

УДК 82.0(082)
ББК 83.3(4)я43

**Полоцкий государственный университет**

**Редколлегия:**
А.А. Гугнин – доктор филологических наук (отв. ред.);
Д.А. Кондаков – кандидат филологических наук;
Т.М. Гордеенок – кандидат филологических наук;
Р.В. Гуревич – доктор филологических наук;
Г.Н. Ермоленко – доктор филологических наук;
Е.А. Зачевский – доктор филологических наук;
З.И. Третьяк – кандидат филологических наук;
Н.Б. Лысова – кандидат филологических наук;
С.М. Лясович – кандидат филологических наук;
С.Ф. Мусиенко – доктор филологических наук;
М.Д. Путрова – кандидат филологических наук;
Л.Д. Синькова – доктор филологических наук;
И.А. Чарота – доктор филологических наук.

**Рецензенты**:
кандидат филологических наук, профессор,
заведующий кафедрой зарубежной литературы МГЛУ Ю.В. Стулов,
кандидат филологических наук, доцент,
заведующий кафедрой перевода БГУ Д.О. Половцев

**Романо-германская филология. Контексты культуры и литературные связи** : междунар. сб. науч. ст. / Полоцкий гос. ун-т ; редкол.: А.А. Гугнин (отв. ред.) [и др.] – Новополоцк, 2017. – 352 с.
ISBN 978-985-531-572-9.

В настоящем международном научном сборнике, продолжающем предыдущие издания (2011 и 2013 гг.) кафедры мировой литературы и иностранных языков Полоцкого государственного университета, публикуются статьи по актуальным вопросам романо-германской и славянской филологии, методологии литературоведческих исследований, методике преподавания гуманитарных дисциплин. Особое внимание в данном сборнике уделено проблемам конкретно-исторического изучения литературных взаимосвязей, а также философским, социальным и литературоведческим аспектам изучения проблемы войны и мира.

УДК 82.0(082)
ББК 83.3(4)я43

**ISBN 978-985-531-572-9**
© Полоцкий государственный университет, 2017

PolotskSU



ром фактов, отмечает дискуссионность основного тезиса: «...отрицание всякого стимулирующего влияния ислама и турок на культуру не останется без возражений, несмотря на многообразные аргументы...» [1, с. 241]. И действительно, до 1982 года докторская диссертация Нобелевского лауреата не была издана на сербском языке. Этот факт Зоран Константинович связывает с нежелательным для тогдашней политики Югославии содержанием диссертации, по крайней мере, в одном из его прочтений.

Обобщая все сказанное в докторской диссертации, И. Андрич констатирует: «По своему географическому положению Босния на самом деле должна была бы связать страны Подунавья с Адриатическим морем, то есть объединить два полюса сербохорватского региона и в то же время две различные области европейской культуры. Попав под влияние ислама, Босния не просто была лишена возможности исполнить это принадлежавшее ей по естеству своему предназначение и включиться в культурное развитие христианской Европы, к которой принадлежит с этнографической и географической точек зрения. Но, более того, из-за формирования здесь исламизированной среды, Босния стала мощной преградой для христианского Запада» [1, с. 53].

Таким образом, И. Андрич в диссертации позволяет себе условное наклонение, которого, казалось бы, не терпит история. Босния была многоконфессиональным краем еще до турецкого нашествия. И тенденции к ее изоляции от окружающего культурного пространства существовали – и, преимущественно, в деятельности богомилов. Исторический путь Боснии еще в дотурецкий период был довольно извилистым, доминанты в культуре и политике еще не было, но, тем не менее, тенденции намечались. Географическое положение Боснии и сложившиеся на тот момент обстоятельства способствовали тому, что Босния должна была стать мостом между двумя берегами, а не разделяющей стеной. Отсюда, вероятно, стремление И. Андрича строить мосты в художественном мире, и об этом в романе «Мост на Дрине» его гимн мостам, которые, будто крылья ангелов, соединяют разорванные дьяволом края земли.

ЛИТЕРАТУРА

1. Андрић, И. Развој духовног живота у Босни под утицајем туске владавине / И. Андрић // Свеске задужбина Иве Андрића. – № 1. – Београд: Задужбина Иве Андрића, 1982. – С. 7–259.
2. Андрич, И. Травницкая хроника. Мост на Дрине / И. Андрич. – М.: Художественная литература, 1974. – 686 с.
3. Константиновић, З. О Андрићевом докторату / З. Константиновић // Свеске задужбина Иве Андрића. – № 1. – Београд: Задужбина Иве Андрића, 1982. – С. 259–277.

## РЭАЛІЗАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ Ў БЕЛАРУСКІМ КАНТЭКСЦЕ

**Т.Р. Багарадава**
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларусь*

Беларусь – краіна вялікага духоўнага патэнцыялу, які грунтуецца на багатай гістарычнай спадчыне. Пытанне вызначэння нацыянальнай ідэі было для нашай краіны адным з вядучых. Трансфармуючыся на працягу шэрагу стагоддзяў пад уплывам палітычных і сацыяльных абставін, яно і на сённяшні дзень не згубіла актуальнасці. Развіццё беларускай культуры і, адпаведна,нацыянальнай ідэі звязана з шэрагам перыядаў. Развіццю нацыянальнай ідэі спрыяў час пасля прыняцця хрысціянства ў X стагоддзі. У выніку Беларусь дала свету шэраг духоўных падзвіжнікаў, якія сталі вядомыя ўсёй цывілізаванай Еўропе: Еўфрасінню, Клімента і Кірылу – выхадцаў са знакамітых беларускіх гарадоў Полацка, Смаленска і Турава, якія зрабілі ўнёсак у скарбніцу не толькі айчыннай, але і сусветнай культуры.

Ф. Скарына, М. Гусоўскі, Радзівіл Чорны, П. Скарга, М. Сматрыцкі, Л. Сапега – вось далёка не поўны пералік беларускіх дзеячаў, якія стаялі ля вытокаў нацынальнай культуры і паспрыялі ідэнтыфікацыі нашай краіны ў сусветнай прасторы. Адпаведна, з прыняццем хрысціянства, росквітам Вялікага княства Літоўскага, Рэфармацыяй звязана змена поглядаў на вызначэнне нашай краіны і народа.

Беларуская нацыянальная ідэя адметная менавіта сваім ярка выражаным мірным характарам і адсутнасцю вялікадзяржаўных памкненняў. У XIX стагоддзі самаідэнтыфікацыю беларусаў і станаўленне беларускай нацыі засведчыла новая беларуская літаратура: ад рамантыка Я. Чачота да асветніцкага рэаліста Ф. Багушэвіча.

Упершыню выразна нацыянальная ідэя была сфармулявана напачатку XIX стагоддзя прафесарамі Віленскага ўніверсітэта М. Баброўскім і І. Даніловічам. Яе складовыя часткі: адраджэнне мовы і культуры, нацыянальнай самасвядомасці з канчатковым выхадам на ўсталяванне беларускай дзяржаўнасці. Імператывы беларускай (ліцвінскай) нацыянальнай ідэі былі абвешчаны таксама ў сацыяльна-культурных праграмах паўстанцаў 1831–1832 гадоў і 1863–1864 гадоў. У прадмовах да зборнікаў «Дудка бела-

PolotskSU



руская» (1891) і «Смык беларускі» (1894) «бацька адраджэння» Ф. Багушэвіч у жанры афарыстычнай публіцыстыкі напісаў пранікнёныя радкі пра душу беларускай нацыянальнай ідэі – мову. Аўтар выразна ўсвядоміў сацыяльную і культурную місію беларусаў у Вялікім княстве Літоўскім, паставіўшы нашу дзяржаву ў цэнтр утварэння і надаўшы мове статус дзяржаўнай і літаратурнай: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы» [1]. Варта адзначыць, што ўласна беларускі рух пачаўся ў канцы XIX стагоддзя. А. Трусаў канстатуе: «Цэнтрам беларускага культурнага руху канца XIX – пачатку XX стагоддзяў стала цэнтральная частка Беларусі: Вілейскі, Менскі, Слуцкі і Віленскі паветы. Адсюль выйшла амаль палова дзеячоў беларускага культурнага руху» [2].

Такім чынам, перыядам удасканальвання беларускай ідэі варта лічыць перыяд 1861–1917 гадоў. Дзеячы газеты «Наша Ніва» (1906–1915 гады – «нашаніўскі перыяд»), класікі беларускай літаратуры, першая нацыянальная партыя (Беларуская сацыялістычная грамада) стваралі беларускую нацыю, яе самабытную культуру і практычную праграму нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. З 1901 па 1917 гады выйшла ў свет 245 кніжак, з 1918 па 1920 – 155 найменняў. Чарговым перыядам развіцця беларускай ідэі варта лічыць 1918–1929 гады. Перыяд Першай сусветнай вайны спрыяў развіццю беларускай нацыянальнай свядомасці. У Мінску пасля Лютаўскай рэвалюцыі адбываюцца першыя беларускія з’езды (у тым ліку Усебеларускі, снежань 1917 года), дзе асаблівае месца надавалася развіццю культурнага поля. Вядучым стала пытанне абрання краінай свайго нацыянальнага шляху развіцця і вызначэння, першай спробай якога з’яўляецца абвяшчэнне 25 сакавіка 1918 года БНР.

У выніку палітычных пераўтварэнняў Рыжскай дамовай 1921 года Беларусь была падзелена на дзве часткі, што на працяглы перыяд вызначыла яе далейшае сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё. У Заходняй Беларусі беларускую нацыю складалі пераважна вясковыя сяляне, нацыянальныя грамадскія дзеячы і асветнікі. Для яе пачаўся новы этап абгрунтавання і рэалізацыі нацыянальнай ідэі на ўзроўні нацыянальна-дэмакратычных партый, культурна-асветніцкіх арганізацый, друку і літаратуры. У БССР за перыяд афіцыйнай палітыкі беларусізацыі (1921–1929 гады) сталі функцыянаваць дзяржаўныя і сацыяльныя інстытуты, вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы, была створана школьная сістэма. На непрацяглы час беларуская мова набыла статус дзяржаўнай. У перыяд 1920-х гадоў беларускую культурную традыцыю пачалі разглядаць у сувязі са спадчынай Вялікага княства Літоўскага. Цэнтральны Выканаўчы камітэт Саветаў Беларусі ў лютым 1921 года звярнуўся з адозвай да культурных працаўнікоў, якія знаходзіліся па-за межамі Беларусі, заклікаючы да вяртання на Радзіму і працы на яе карысць. Пачаўся чарговы этап беларускага адраджэння. Паводле сцверджанняў Л. Глагоўскай: «Развіццё беларускай культуры ў 1920-я гады ў Савецкай Беларусі не мела ў сабе роўнага прэцэдэнту на беларускіх землях у Польшчы, ні ў БССР пазнейшай пары» [3]. 1930-я гады сталі для Беларусі часам жахлівых сталінскіх рэпрэсій і пазначаны барацьбой з так званай «нацдэмаўшчынай». За перыяд з 29 па 30 кастрычніка 1937 года было знішчана больш за пяцьдзесят беларускіх культурных дзеячаў і літаратараў. Нацыянальная ідэя ў дадзены перыяд адлюстравана перш за ўсё ў літаратуры. Побач з праблемамі татальнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі гуманістычны падыход да праблем чалавека стаў вызначальнай рысай адпаведнага перыяду. Не вобразы савецкіх «камікадзе» і калектыўная свядомасць, а індывідуальны падыход да жывой чалавечай душы, разгляд псіхалогіі чалавека цікавіць беларускіх раманістаў. Імёны К. Крапівы, М. Зарэцкага, К. Чорнага звязаны, у першую чаргу, з адлюстраваннем паўсядзённай рэчаіснасці, прапагандай нацыянальнага, беларускага менталітэту і побыту.

Другая сусветная вайна спарадзіла чарговы этап беларускага адраджэння. Побач з утварэннямі, што традыцыйна ў савецкай гістарыяграфіі лічацца калабаранцкімі, варта прыгадаць беларускія арганізацыі, якія спрыялі адраджэнню нацыянальнай ідэі. У гады вайны былі створаны аб’яднанні: Беларуская нацыянальная Самапомач (1941), Саюз беларускай моладзі (СБМ), Беларуская незалежніцкая партыя (БНП), актывізавалася Беларуская аўтакефальная царква. У 1942 годзе у Беларусі арганізаваны шырокі нацыянальны рух – Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР) на чале з Р. Астроўскім. Былі адкрыты беларускія школы, народныя бібліятэкі, аднаўлена праца Мінскага Беларускага тэатра. Беларускімі кампазітарамі было напісана больш за 60 музычных твораў. Паводле А. Астапенкі: «На момант гарбачоўскай перабудовы – а менавіта з гэтых часоў пачынаецца новы гістарычны працэс у СССР – Беларусь падыйшла амаль абезгалоўленай, не маючы мойнай нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, не маючы ўсведамлення сябе як нацыя і дзяржава. Дзве хвалі масавага тэрору – рэпрэсіі 1930-х гадоў і пераслед «нацыяналістаў» пасля 1944 года далі сваім сумным вынікам татальную дэнацыяналізацыю» [4]. Бадай, толькі ў літаратуры захаваліся рэшткі нацыянальнага; прынамсі, пра гэта можна меркаваць па творах В. Быкава, У. Караткевіча, В. Адамчыка, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна і інш. У часы гарбачоўскай перабудовы пачаўся рух за нацыянальнае адраджэнне народаў былой савецкай імперыі, якая развалілася ў 1991 годзе. Нацыянальны рух назіраўся і ў Беларусі. Пачалаўся чарговы перыяд беларускага нацыянальнага адраджэння (1988–1996). За гэты невялікі ў гістарычным плане прамежак часу меў месца працэс беларусізацыі вышэйшай школы. Акрамя таго, пачалося адкрыццё беларускамоўных школ, класаў і дзіцячых садкоў. Была верну-

PolotskSU



тая з небыцця нацыянальная сімволіка: бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня». Актыўна развівалася беларускае музычнае мастацтва. Адбывалася масавае друкаванне твораў культурных і літаратурных дзеячаў часоў культу асобы, апошняя хваля рэабілітацыі рэпрэсаваных у сталінскі час. Такім чынам, нацыянальная ідэя ў дадзены перыяд спалучылася з працэсамі дэмакратызацыі грамадства, што тлумачыцца адсутнасцю абодвух на працягу доўгага прамежку часу.

З 1996 года пачаўся чарговы перыяд у нацыянальнай палітыцы Беларусі. Знікла большасць дасягненняў апошняй хвалі беларускага адраджэння. У краіне назіраецца білінгвістычная сітуацыя – дзяржаўнасць рускай і беларукай моў, што не спрыяе развіццю нацыянальнай культуры і асяроддзя. На дадзеным этапе, у пачатку XXI стагоддзя, важна вызначыць прыярытэтныя накірункі развіцця нацыянальнай ідэі. На гэты конт існуе шмат супрацьлеглых меркаванняў, якія варта звесці да некалькіх аспектаў. Першы аспект радыкальны і акрэсліваецца ў вызначэнні А. Тараса: «У нас няма нацыянальнай ідэі, якую падзяляла б большасць насельніцтва. Ёсць розныя пункты гледжання, але асабіста я фармулюю нацыянальную ідэю коратка: «Беларусь перадусім». Гэта значыць, што інтарэсы краіны і народа ў знешняй і ўнутранай палітыцы павінны быць на першым месцы» [5]. Другі выражаецца як разуменне нацыянальнай ідэі ў вузкім этнічным сэнсе: трэба размаўляць на мове, паважаць беларускую культуру, песні, фальклор (так званая, моўна-этнічная нацыянальная мадэль). Трэці падыход акумулюе нацыянальнае і рэлігійнае. Нацыяналізм знаходзіць абгрунтаванне ў хрысціянстве. Паводле А. Астапенкі: «Хрысціянства – гэта любасць, якая пашыраецца да ўсіх людзей, збліжае іх; яно ўключае ўсю паўнату ўсяленскай любові. Самае каштоўнае ў хрысціянстве тое, што яно сцвярджае індывідуальнасць асобы. А нацыяналізм – гэта індывідуальнасць цэлага народа і любасць да гэтай індывідуальнасці. Такім чынам, калі мы звяртаемся да нацыяналізму, то яго сутнасць благаслаўляецца менавіта рэлігіяй – сутнасць як любасць да індывідуальнасці вышэйшага ўзроўню» [6]. Асноўнымі задачамі нацыянальнай ідэі П. Севярынец лічыць «хрысьціянізацыю беларусаў і беларусізацыю хрысьціянаў» [7]. Вызначэнне беларускай нацыянальнай ідэі шматпланавае. Найбольш поўна, на нашу думку, яно адлюстравана ў выказванні У. Конана: «Сутнасць беларускай ідэі – ўсведамленне Боскага і гістарычнага паклікання свайго народа, яго шматвяковай традыцыі, яго місіі ў гістарычным і сучасным быцці народаў свету. Беларуская ідэя – гэта таксама выяўленне ў філасофіі, літаратуры, мастацкай культуры, навуцы быцця Беларусі ў трох вымярэннях – мінуўшчыне, сучаснасці і будучыні» [8].

Нацыянальная ідэя – нематэрыяльнае ўтварэнне, якое мае каласальную патэнцыяльную энергію, здольную пераратварыць ахоплены ёй соцыум у непераможную стваральную сілу. Нацыянальная ідэя матэрыялізуецца з дапамогай людзей, якія яе спавядаюць. Духоўная і матэрыяльныя кампаненты нацыянальнай культуры выступаюць адначасова як спосаб, і як прадукт нацыянальнага жыцця. Нацыянальная культура ёсць матэрыялізацыя нацыянальнай ідэі. Нацыянальная ідэя ўяўляе імкненне чалавека ўсвядоміць сябе ў сваёй нацыі і сваёй нацыянальнай дзяржаве. Вырашэнне нацыянальнай беларускай праблемы бачыцца ў падтрыманні курса на пабудову суверэннай і незалежнай Беларусі, дзе створаны ўсе ўмовы для ажыццяўлення нацыянальнай дзейнасці ў садружнасці з дзяржавамі еўрапейскай супольнасці.

ЛІТАРАТУРА


1. Buraczok, M. Dudka Białaruskaja / M. Buraczok. – Kraków, 1891. – S. 3–5.
2. Трусаў, А. Беларуская мова і нацыянальная ідэалогія / А. Трусаў // Беларуская мова [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://www.istpravda.ru/bel/digest/765/. – Дата доступу: 04.01.15.
3. Глагоўская, Л. Роля культуры ў развіцці беларускай нацыянальнай свядомасці ў міжваенны перыяд / Л. Глагоўская // Нацыянальная самасвядомасць у гістарычным развіцці [Электронны рэсурс]. – 2013. – Рэжым доступу: http://kamunikat.fontel.net. – Дата доступу: 04.01.15.
4. Астапенка, А. Беларускі нацыяналізм у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі / А. Астапенка // Нацыянальная самасвядомасць у гістарычным развіцці [Электронны рэсурс]. – 2013. – Рэжым доступу: http://kamunikat.fontel.net. – Дата доступу: 04.01.15.
5. Тарас, А. У беларусаў няма выразна сфармуляванай нацыянальнай ідэі / А. Тарас // Народная воля [Электронны рэсурс]. – 2014. – Рэжым доступу: http://www.nv-online.info/by/339/printed/55343/htm. – Дата доступу: 05.01.15.
6. Астапенка, А. Трэба ствараць Беларусь / А. Астапенка // ARHE [Электронны рэсурс]. – 2014. – Рэжым доступу: http://inbelhist.org/treba-stvarac-belarus. – Дата доступу: 05.01.15.
7. Севярынец, П. Нацыянальная ідэя. Фенаменалёгія Беларусі / П. Севярынец // Беларуская палічка // [Электронны рэсурс]. – 2014. – Рэжым доступу: http://bchd.info/index.php?newsid=3393. – Дата доступу: 05.01.15.
8. Конан, У. Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі: Філасофскае абгрунтаванне беларускай ідэі / У. Конан // Бібліятэка гістарычных артыкулаў [Электронны рэсурс]. – 2014. – Рэжым доступу: http://www.jivebelarus.net/history/html. – Дата доступу: 05.01.15.